«Предварительные общеевропейские итоги говорят: у аистов наблюдается тенденция к образованию оседлых группировок, из которых птицы не улетают зимовать далеко на юг. Особенно это заметно в западной части европейского ареала белого аиста – в Испании и Португалии, где климат гораздо мягче нашего. Тенденция стала наблюдаться в Восточной Европе: все чаще аисты остаются зимовать в соседней Польше, больше случаев зимовки отдельных птиц отмечается и в Беларуси. Этому способствуют мягкие зимы и достаточная кормовая база. Например, на мусорных свалках некоторые пернатые могут добывать корм на протяжении всего года, – рассказала И.Самусенко. – Во время наблюдений в Западной Европе отмечается, что все больше аистов начинают проводить зиму рядом со свалками. У нас такие факты пока не зарегистрированы, но в летнее время это обычное явление. Причем больше всего птиц, которые кормятся пищевыми отбросами, наблюдается в западной части Беларуси – ближе к Польше, где такое поведение стали отмечать около 20 лет назад».

Неправильное питание

К международным наблюдениям за птицами на свалках белорусские орнитологи подключились с 2016 года. В связи с тем, что с 2017 года в странах ЕС постепенно закрываются открытые свалки, благодаря которым в Европе образовалась зимующая группировка аистов, они стали остроактуальными. Но как это повлияет на самих птиц, орнитологи пока не берутся утверждать, однако уже выражают обеспокоенность. Остается неизученным также вопрос, как питание неестественными продуктами на свалках сказывается на птичьем организме. «Там аисты выбирают мясную и белковую пищу: соленую селедку, остатки колбас, копченых кур. А она содержит добавки и соли, нежелательные для птиц», – рассказала собеседница.

Многие вопросы, которые для Польши давно актуальны и решаются, в Беларуси только разрабатываются. К примеру, безопасность соседства аистов с электрооборудованием рассматривается странами на разных уровнях. Если в Польше уже пришли к пониманию важности установки специальных платформ для размещения искусственных гнездовий и обсуждается вопрос ответственности за них, то в Беларуси этот процесс находится лишь на начальном этапе – энергетики пока не уделяют достаточно внимания безопасности птиц. Возможно, это связано с тем, что наши аисты на 2-3 десятилетия позже начали выбирать для гнездования столбы электролиний взамен традиционным крышам или деревьям.

Валентина ЛЕСНОВА, «Навука»
Фото из архива И.Самусенко

В МИРЕ ПАТЕНТОВ

УБОРКА КЛЕВЕРА – В ОПТИМАЛЬНЫЕ СРОКИ

и без потерь (патент Республики Беларусь № 20607, МПК (2006.01): A 01G 7/06; авторы изобретения: С.В.Сорока, Е.А.Якимович, С.В.Гавриков, В.М.Макаро, Л.С.Рутковская; заявители и патентообладатели: Институт защиты растений, Гродненский зональный институт растениеводства НАН Беларуси).

Изобретение предназначено для химического подсушивания семенных посевов клевера ползучего перед уборкой. Как поясняется авторами, одним из важных элементов технологии выращивания семян клевера ползучего является проведение уборки в оптимальные сроки и без потерь, что очень сложно сделать при неблагоприятных погодных условиях. Период цветения клевера очень растянут и при достаточной обеспеченности влагой может продолжаться до заморозков. Поскольку в период созревания семян такие условия складываются на территории нашей страны очень часто, возникает необходимость в применении эффективных способов, ускоряющих подсушивание вегетативной массы растений, среди которых важная роль отводится так называемым десикантам.

Авторами предложен способ десикации посева клевера ползучего при возделывании на семена, включающий обработку растений раствором «десиканта» при «побурении» 75–80% семенных «головок» клевера. В отличие от ранее известных способов десикации в разработанном учеными способе в качестве «десиканта» используют препарат «Голден ринг, ВР» в дозе 4,0 л/га, растворенный в 200–400 л воды.

Подготовил Анатолий ПРИЩЕПОВ, патентовед

АНТАЛОГІЯ ПАЭЗІІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

У Інстытуце літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі завершаны праект «Паэзія Заходняй Беларусі: анталогія».



Супрацоўнікі аддзела ўзаемасувязей літаратур

Праект выконваўся аддзелам узаемасувязей літаратур сумесна з кафедрай беларускай філалогіі Універсітэта ў Беластоку па гранце БРФФД. У працы ўпершыню ў нацыянальным літаратуразнаўстве распрацаваны тэарэтыка-метадалагічныя прынцыпы і канцэптуальныя асновы анталогіі паэзіі Заходняй Беларусі (1921–1939) як ідэйна-мастацкай сістэмы. Выяўлены ідэйна-мастацкая спецыфіка і грамадска-культурны феномен заходнебеларускай паэзіі.

Вынікам распрацоўкі праекта з'явіўся збор мастацкіх твораў (вершаў) прыкладна каля 100 аўтараў. У параўнанні са зборнікам заходнебеларускай паэзіі «Ростані волі», падрыхтаваным і выдадзеным у 1990 годзе У.Калеснікам, у акадэмічную анталогію ўключаны дзясяткі новых аўтараў, такіх як Яўген Бартуль, Пятро Сакол, Сяргей Хмара і інш. Стваральнікам анталогіі заходнебеларускай паэзіі ўдалося адшукаць у архівах і рэдкіх перыёдыках вершы зусім невядомых паэтаў, якія не толькі не аналізаваліся літаратуразнаўцамі, але нават і не ўпаміналіся імі, – таленавітых выхадцаў з масавай паэзіі Янкі Чорнага, Янкі Бунтара, Мікалая Базылюка, Аркадзя Заранкі і інш. Яны маюць прыкметнае гісторыка-літаратурнае і ідэйна-мастацкае значэнне.

Даследаванне вызначаецца аналітычнасцю, сістэмна-комплексным характарам вывучэння гісторыка-літаратурнага працэсу. Цесна ўзаемадзейнічаючы з прыбалтыйскім і заходнеўкраінскім літаратурна-мастацкімі працэсамі, паэзія Заходняй Беларусі знаходзілася пад моцным уплывам, з аднаго боку, савецкай, а з другога – еўрапейскіх (чэшскай, славацкай, нямецкай і інш.) літаратур. Гэта забяспечыла эвалюцыю і фарміраванне ў ёй розных, часам нават супрацьлеглых ідэйна-светапоглядных і мастацка-выяўленчых канстант і ліній.

Паэтам Заходняй Беларусі даводзілася працаваць у цяжкіх, неспрыяльных для прадуктыўнай мастацкай творчасці грамадска-палітычных і сацыяльна-маральных умовах. Многія аўтары валодалі бясспрэчным мастацкім талентам, аднак у сувязі з палітычна-ідэалагічным уціскам, сацыяльнай і нацыянальнай несправядлівасцю не здолелі яго рэалізаваць.

У параўнанні з добра вывучанай паэзіяй Савецкай Беларусі 1920–1930-х гадоў, заходнебеларуская была адным з асноўных і дзейсных сродкаў раскрыцця грамадскай свядомасці «забранага краю», а яе развіццё ажыццяўлялася ў шырокім спектры грамадска-культурнага ўзаемадзеяння, ва ўмовах жорсткай партыйна-ідэалагічнай і палітычнай барацьбы і супрацьстаяння.

Варта падкрэсліць, што, у адрозненне ад БССР, заходнебеларуская рэчаіснасць вызначалася балансам нацыянальна-патрыятычнага, этнакультурнага і грамадска-палітычнага, рэвалюцыйнага пачаткаў, якія пэўным чынам ураўнаважваліся ў яе духоўна-сацыяльнай прасторы. Яна характарызавалася высокім узроўнем народна-патрыятычнай самасвядомасці, наяўнасцю шырокага пласта нацыянальна ўстойлівай і актыўнай творчай інтэлігенцыі.

Феномен заходнебеларускай паэзіі, як і ў цэлым літаратуры і культуры, заключаўся ў тым, што яна мела ў многім самадастатковы, аўтаномны характар і ўяўляла сабою пэўнае духоўна-мастацкае адзінства і цэласнасць. У ёй актыўна прадуцыравалі і тыя з'явы і працэсы, якія не маглі знайсці свайго развіцця ва ўмовах Савецкай Беларусі. Больш за тое, якраз падвергнутае жорсткай крытыцы, пераследу і адмаўленню, фактычна забароненае на Усходзе, на Захадзе развівалася асабліва прадуктыўна і выніkова.

Упершыню падрыхтаваная акадэмічная анталогія паэзіі Заходняй Беларусі выяўляе цэласную сістэму дыяхроннага ўзаемадзеяння і ўзаемаабумоўленасці лірыка-апавядальнай, рамантычнай і духоўна-ірацыянальнай мастацка-стылявых плыней, якія складаюць дынамічную карціну яе ідэйна-эстэтычнага багацця і разнастайнасці, з'яўляецца важным базава-факталагічным матэрыялам для вывучэння ўсёй літаратурнай гісторыі Беларусі XX стагоддзя.

Навуковая значнасць вынікаў даследавання заключаецца ў напрацоўцы якасна новага факталагічнага матэрыялу і яго сістэмным абагульненні і інтэрпрэтацыі, у раскрыцці вызначальных тэндэнцый і заканамернасцей развіцця беларускай паэзіі XX стагоддзя, паглыбленні і пашырэнні гісторыка-тэарэтычных асноў вывучэння беларускай нацыянальнай літаратуры ў яе абумоўленасці знакавымі з'явамі еўрапейскай культуры і мастацтва, стварэнні поўнай гісторыка-літаратурнай карты Беларусі. Яны знойдуць рэалізацыю пры рашэнні актуальных праблем айчыннага літаратуразнаўства, у напісанні падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў новага пакалення па гісторыі літаратуры, у выкладчыцкай рабоце са студэнтамі і школьнікамі.

Мікола МІКУЛІЧ,
кандыдат філалагічных навук

ХАОС, СОЗНАНИЕ И РОБОТЫ



Смогут ли роботы когда-нибудь обладать хотя бы подобием психики, сознания и субъективных ощущений? Удастся ли науке преодолеть пропасть, разделяющую механизм и организм, разрешить давнее философское противоречие между духом и машиной, духом и материей?

Эти и другие вопросы затронули ученые и специалисты Института философии и Объединенного института проблем информатики НАН Беларуси в рамках совместного научного семинара «Философские проблемы естествознания и техники», прошедшего на базе лаборатории робототехнических систем ОИПИ НАН Беларуси. На заседании с докладом «Хаос и самоорганизованная критичность в моделировании естественного и искусственного сознания» выступил старший научный сотрудник Центра философско-методологических и междисциплинарных исследований Института философии НАН Беларуси Андрей Колесников. В докладе была затронута проблематика применения теорий хаоса и самоорганизованной критичности в качестве основы для моделирования некоторых элементов психических процессов и функций сознания. На примерах компьютерных клеточно-автоматных моделей была продемонстрирована принципиальная возможность воссоздания взаимосвязи микро- и макроуровня организации перспективных робототехнических устройств, что, в принципе, открывает потенциал для моделирования некоторых элементов субъективных ощущений. С теоретической точки зрения это интересно, так как позволяет сделать очередной шаг на пути познания природы нас самих, что составляет основной предмет исследования в области философии. С практической точки зрения это открывает новые горизонты в области создания автономных бионических роботизированных устройств, способных функционировать в переменных средах и адаптироваться в неизвестной обстановке, подобно тому, как это делают живые существа.

Александр СПАСКОВ,
Андрей КОЛЕСНИКОВ,
Институт философии
НАН Беларуси

ДЛЯ ПРОРАСТАНИЯ СЕМЯН ЯЧМЕНЯ

Человечество ведет активный поиск методов и технологий для целенаправленного воздействия на морфофизиологические процессы живых организмов. Одним из таких факторов является электромагнитное излучение (ЭМИ).

В настоящее время идет изучение как совместного воздействия ионизирующего и неионизирующего излучений на живые организмы, так и отдельно ионизирующего излучения и неионизирующего электромагнитного излучения разных длин волн.



Ячмень – наиболее распространенное сырье для кормовой базы животных, производства пива и продовольствия. Выращивание сельскохозяйственной продукции на землях, загрязненных радионуклидами после чернобыльской катастрофы, требует дополнительных методов защиты растений и сохранения их жизненных сил для дальнейшего использования. Положительно повлиять на качество культуры при сборе урожая поможет стимулирование ростовых процессов при предпосевной обработке семян.

Материалом для исследования послужили семена ячменя сорта «Бровар». На сухие семена воздействовали гамма-излучением в дозах 2,5; 5,0 и 100 Гр. Затем их проращивали в водопроводной воде при температуре 24±2°С. После часть облученных и необлученных семян проращивали в зоне воздействия ЭМИ, которое генерировалось установкой КЗАР (комплекс защиты и активации роста) «Аэротон». Далее, на 3-й, 5-й, 7-й и 9-й день, проводилась оценка проростков семян: лабораторная всхожесть и биомасса первого листа.

Установка «Аэротон» генерирует слабые электромагнитные поля с заданной периодичностью во времени и пространстве и с определенной направленностью излучения, сконцентрированного коническими волноводами. В исследованиях по влиянию КЗАР на прорастание семян озимой пшеницы и овса было установлено стимулирующее действие ЭМИ на рост и развитие растений. Отмечено, что ЭМИ модифицирует отрицательное действие ионизирующего облучения (доза 50 Гр) на растения.



Сотрудник Института радиобиологии С.Гапоненко

Для характеристики качества семян используют несколько критериев оценки, один из них – всхожесть семян. В контрольной группе она составила 87%. После гамма-облучения в дозе 2,5 и 5,0 Гр наблюдалась тенденция к повышению всхожести на 2,6–3,0%, что подтверждается многочисленными сторонними исследованиями – данные дозы имеют стимулирующий эффект.

После обработки ЭМИ необлученных и облученных семян в дозе 2,5 и 3,0 Гр наблюдалось повышение всхожести. У семян, облученных в дозе 100 Гр, процент всхожести не изменился и остался на уровне контроля. Всхожесть семян, облученных ионизирующим излучением и ЭМИ, составила 106,5% и 107,4% соответственно по сравнению с контролем.

Еще один критерий оценки качества семян – это число зародышевых корешков и длина ростка. Для оценки жизнеспособности семян с 3-го по 9-й день проводилась оценка числа корешков и длина ростка. Семена с длиной ростка более 2,5 см и числом корешков более трех считались сформированными и жизнеспособными. Выявлено, что ЭМИ стимулировало ростовые процессы во всех вариантах по сравнению с контролем.

При анализе растений по биомассе первого листа было установлено, что при обработке электромагнитным излучением и сочетании электромагнитного и гамма-излучения наблюдается увеличение биомассы первого листа во всех вариантах.

В ходе экспериментов выявлено, что электромагнитное излучение, генерируемое установкой КЗАР «Аэротон», положительно влияет как на необлученные растения, так и на растения, которые подверглись гамма-облучению.

Сергей ГАПОНЕНКО,
Институт радиобиологии

УМЕНЬШИТЬ ТРАВМИРОВАНИЕ КЛУБНЕЙ

(патент Республики Беларусь № 20637, МПК (2006.01): B65G 65/30; авторы изобретения: Д.И.Комлач, А.С.Воробей, А.Н.Антоненко; заявитель и патентообладатель: НПЦ НАН Беларуси по механизации сельского хозяйства).

Авторами предложен «Автоматический наполнитель контейнеров клубнями картофеля». Задача изобретения – расширение функциональных возможностей наполнителя контейнеров и уменьшение травмирования клубней при попадании в контейнеры различной вместимости.

В разработанном устройстве использование «телескопической стойки» (с гидроцилиндром для установки транспортера на основании наполнителя) позволяет оперативно изменять высоту расположения транспортера при «заполнении контейнеров различной конструкции и вместимости». Данное заполнение начинается с минимальной высоты и плавно (за счет автоматического подъема «поворотной стрелы» и горизонтального перемещения «передвижной тележки») свободное пространство контейнера полностью загружается, что значительно снижает травмирование клубней картофеля.

Подготовил
Анатолий ПРИЩЕПОВ,
патентовед



Re, non verbis!

Быць даследчыкам-фалькларыстам – справа няпростая, адказная, бо вымагае і ведаў, і разумення народнага жыцця ў многіх яго аспектах і паваротах. Гэта далёка не толькі кабінетная праца, але і шматлікія экспедыцыі, дзе фалькларыст разам з інфармацыяй аб жыцці мінулым і сённяшнім успрымае надзвычай багаты эмацыйны складнік народнага светаразумення. Запісаць, адчуць, прааналізаваць, прадэманстраваць багацце народных ведаў і талентаў грамадскасці – няпоўны пералік абавязкаў фалькларыста.

6 красавіка святкавала юбілей адна з самых яркіх прадстаўніц сучаснай беларускай фалькларыстыкі – навуковы супрацоўнік аддзела этналінгвістыкі і фальклору Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Алена Міхайлаўна Боганева. Алена вырасла ў Мінску і з традыцыйным фальклорам упершыню сустрэлася на філалагічным факультэце БДУ, тады яшчэ не думаючы, што народная творчасць стане прафесійным і жыццёвым захапленнем.

У 1997 годзе А.Боганева ўзначаліла лабараторыю традыцыйнага мастацтва ў БелІПК. Пад яе кіраўніцтвам лабараторыя займалася навукова-даследчай, вучэбна-метадычнай, інфармацыйна-аналітычнай, праектна-праграмнай, нарматыўна-прававой, арганізацыйна-творчай, выдавецкай дзейнасцю. Разам з калектывам Алена Міхайлаўна ажыццяўляла праграму комплекснага навукова-практычнага даследавання гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі «Сучасны стан традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў». Выйшла шэсць тамоў гэтага выдання ў 10 кнігах, якія былі высока ацэнены грамадскасцю. У 2015 годзе А.Боганева ў складзе творчага калектыву стала лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва.

Пры ініцыяванні і ўдзеле лабараторыі падрыхтаваны дзяржаўныя нарматыўна-прававыя дакументы ў галіне традыцыйнага мастацтва і шэраг дзяржаўных праграм па захаванні і падтрымцы народнага мастацтва, народных промыслаў і рамёстваў у Рэспубліцы Беларусь.



Алена Боганева

З 2009 года Алена Міхайлаўна працуе ў акадэмічным Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры. Ёй належыць першынство ў збіранні і даследаванні так званай народнай Бібліі – вусных пераказаў Святога Пісання. У кнізе «Беларуская «народная Біблія» ў сучасных запісах» (Мінск, 2010) абагульнены багаты запісаны па ўсёй Беларусі матэрыял. А.Боганева – прызнаны спецыяліст у галіне вывучэння народнай прозы. Сёння актыўна працуе над стварэннем Беларускага фальклорна-этналінгвістычнага атласа, які прадставіць багацце традыцыйнай культуры беларусаў у яго картаграфічнай праекцыі. Даследчыца годна прэзентуе беларускую навуку на міжнародных форумах (у тым ліку з'ездах славістаў і кангрэсах фалькларыстаў, выступала з дакладам ва ўніверсітэце Сарбона, актыўна друкуецца ў навуковых часопісах, сярод якіх прэстыжныя замежныя выданні).

Спіс яе навуковых публікацый даўно перасягнуў рубеж у сто пазіцый, і кожны з артыкулаў – сапраўдны падарунак для фалькларыстаў. Асобна варта сказаць пра збіральніцкую дзейнасць А.Боганевай. Яна праехала па абсалютнай большасці раёнаў Беларусі і з кожнага куточка прывезла цікавыя запісы. Алена Міхайлаўна лёгка знаходзіць паразуменне з інфармантамі і ў той жа час умее павярнуць гутарку да патрэбных тэм.

Да Алены Міхайлаўны, вельмі сціплай у паўсядзённым жыцці, працаўніцы навукі, якая пазбягае ўсялякай дэманстратыўнасці, як ні да каго іншага падыходзіць вядомы выраз з латыні: «Re, non verbis» (справай, а не словамі).

Свой юбілей Алена Міхайлаўна сустрэла ў няспыннай працы, з творчымі задумамі, планамі, ідэямі і гатоўнасцю іх ажыццявіць. Пажадаем жа ёй поспехаў у яе нялёгкай і такой карыснай для беларускай навукі і культуры працы, моцнага здароўя, бадзёрасці, шчасця!

Таццяна ВАЛОДЗІНА,
Таццяна КУХАРОНАК,
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі

500-годдзе айчыннага кнігадрукавання – добрая нагода звярнуцца да цікавых бібліяфільных тэм. Адна з іх – экслібрыс, своеасаблівы знак уладальніка кнігі. Нядаўна Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі адкрыла выставу экслібрыса «На пачатку слаўных спраў...». Яна рыхтавалася з удзелам Музея экслібрыса і мініяцюрнай кнігі Міжнароднага саюза кнігалюбаў (МСК) у Маскве.



ЗНАК ПАВАГІ ДА КНІГІ

Першыя экслібрысы з'явіліся ў Германіі ў XVI стагоддзі, калі кніга лічылася прадметам раскошы. У XVIII стагоддзі большасць прыватных бібліятэк належала вышэйшым саслоўям, і многія экслібрысы ўяўлялі сабой геральдычныя кампазіцыі – гербы і вензелі. Практычна ўсе знатныя беларускія роды – Радзівілы, Сапегі, Тызенгаўзэны – мелі экслібрысы на сваіх кнігах. У другой палове XIX стагоддзя збіральнікамі бібліятэк усё часцей станавіліся навукоўцы, пісьменнікі, дзеячы мастацтва, багатае купецтва. Гербавыя і вензелевыя экслібрысы паступова выцясняліся сюжэтнымі, станавіліся творамі графічнага мастацтва.



Такія ж тэндэнцыі бачны і на тэрыторыі Расійскай імперыі. А пасля рэвалюцыі экслібрыс ужо нёс не столькі службовыя задачы, колькі стаў самастойным жанрам. Калекцыянеры пачалі збіраць экслібрысы як прадметы мастацтва. Экслібрысы вядомых расійскіх прыватных і грамадскіх кніжных збораў XIX – пачатку XX ст. можна пабачыць на выставе выданняў з фондаў ЦНБ НАН Беларусі. Сярод экспанатаў – кнігі з суперэкслібрысамі і экслібрысамі членаў царскай сям'і, выданні з асабістых бібліятэк прадстаўнікоў знаці – М.Варанцова, А.Апраксіна, С.Шарамецева, са збораў вядомых бібліяфілаў П.Губара, М.Сінягіна.

Больш за 140 кніжных знакаў, якія прадстаўляе на выставе маскоўскі Музей экслібрыса і мініяцюрнай кнігі, прысвечаны Івану Фёдараву. Гэта добра суадносіцца з асветніцкай тэмай выставы, дзе ў шматлікіх кніжных знаках увасобіліся вобразы першадрукароў, у прыватнасці Францыска Скарыны – яму адведзена асобная частка экспазіцыі. Самы ранні экслібрыс тут – кніжны знак выдатнага расійскага мастака І.Білібіна, выкананы ім у 1912 годзе па матывах старадрукаваных заходнееўрапейскіх выданняў. На некаторых мініяцюрах выява самога першадрукара, іншыя навеяныя матывамі характэрнага дэкору выданняў Скарыны, напрыклад, яго знакамітай эмблемай з выявай сонца і паўмесяца. Сярод аўтараў – вядомыя беларускія майстры графікі Г.Галубовіч, Г.Ціхановіч, А.Тычына ды інш. Генадзь Грак, кіраўнік Беларускага народнага клуба экслібрысістаў, аўтар больш за 600 экслібрысаў, прысвяціў Францыску Скарыне цэлы цыкл. Яго імя названа ў энцыклапедычным даведніку «Францыск Скарына і яго час» сярод мастакоў, якія актыўна спрыялі папулярызацыі беларускага першадрукара. На жаль, у фондзе ЦНБ ёсць толькі два знака мастака; тры яго работы з выявай першадрукара былі прадстаўлены маскоўскім калегай з МСК. Г.Грак, які прысутнічаў на прэзентацыі, выказаў надзею на адраджэнне цікавасці да кніжнага знаку і паабяцаў папоўніць калекцыю бібліятэкі сваімі працамі.



Увогуле калекцыя экслібрысаў ЦНБ налічвае больш за 8 тыс. экз. Экслібрыс – справа тонкая, нават элітарная. Вядучы бібліятэкар аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ Іна Мурашова лічыць, што трэба адрозніваць мастацкія і кніжныя крытэрыі каштоўнасці экслібрыса. Гістарычную, кнігазнаўчую каштоўнасць мае той экслібрыс, які знаходзіцца на рэдкіх кнігах ці на кнігах у рэдкіх зборах. Напрыклад, аддзелу ЦНБ належыць бібліятэка беларускага літаратара Пятра Глебкі. Кожная кніга Пятра Фёдаравіча пазначана экслібрысам. Кнігазбор Глебкі лічыцца адным з лепшых сярод пісьменніцкіх бібліятэк свайго часу. Пісьменнік пачаў збіраць яго ў 1920-я гады. Дзякуючы намаганням жонкі пісьменніка кнігі перажылі вайну і служылі яму да канца дзён.



Сёння экслібрыс ацэньваецца пераважна па сваёй мастацкай каштоўнасці, па імені мастака і носіць мастацтвазнаўчы характар. Таму сучасны экслібрыс – гэта перадусім асоба мастака.

Уладальнік адной з буйнейшых калекцый экслібрысаў у Беларусі, якая налічвае некалькі тысяч кніжных знакаў, бібліяфіл Алег Судлянкоў адзначыў на прэзентацыі вялікія поспехі мастакоў-сучаснікаў. Адметна, што з кожным годам усё больш нашых графікаў – майстроў экслібрыса – адбіраюцца для ўдзелу ў міжнароднай біенале экслібрыса ў польскім горадзе Мальбарк, а таксама ў аўтарытэтнай біенале ў Брусэлі. З тых, хто сёння карыстаецца сур'ёзным аўтарытэтам у сусветнай мастацкай графіцы, А.Судлянкоў называе мастакоў Л.Алімава і Г.Вяля з Брэста, Ю.Якавенку і І.Русачыка з Гродна, А.Кашкурэвіча, Р.Сустава і Г.Ціханаву з Мінска.

Выстава экслібрыса будзе працаваць у ЦНБ да канца месяца, у тым ліку падчас «бібліяночы» 21 красавіка. Як нітка сувязі з калекцыямі знакамітых бібліяфілаў, пісьменнікамі, з гісторыяй – толькі графічны, лаканічны стыль экслібрысу можа перадаць такую высокую павагу да кнігі.

Алена ЕРМАЛОВІЧ
Фота аўтара, «Навука»



С 1 по 8 апреля по инициативе Министерства лесного хозяйства в лесхозах Беларуси прошла ежегодная добровольная акция «Неделя леса – 2017».

В этом году ее посвятили восстановлению лесов, поврежденных прошлогодними ураганами. В результате данных мероприятий лесные культуры посажены на 6.700 га.

Каждый год в акции принимают участие школьники, студенты, рабочие и служащие различных предприятий, работники Министерств и ведомств. Так и для сотрудников НПЦ по биоресурсам и Института экспериментальной ботаники (ИЭБ) НАН Беларуси стало хорошей традицией ежегодно участвовать в таких акциях. База активности – ГЛХУ «Молодечненский лесхоз».

Разгул стихии в значительной степени прошелся по Смолевичскому лесхозу, где экстремальными ветрами выкорчевывались целые кварталы лесных массивов, оставляя после себя лишь чудом уцелевшие отдельные деревья. Еще осенью прошлого года многие лесхозы нашей республики активно участвовали в разработке ветровалов и подготовке почв для высадки новых лесных культур, а в этом году поставлена непростая задача по восстановлению лесов.

Большую помощь в этом деле Смолевичскому лесхозу оказывает ГЛХУ «Молодечненский лесхоз». В текущем году «трудовой десант» из вышеназванных учреждений НАН Беларуси (35 человек) выехал на посадку леса в Драчковское лесничество Смолевичского лесхоза. Несмотря на некомфортную погоду, аспиранты и научные сотрудники подключились к восстановительным работам. Под руководством специалистов в местах, где когда-то прошла стихия, ученые высадили более 2 га еловых саженцев.

Лесные питомники Молодечненского лесхоза являются испытательной базой для ИЭБ по изучению болезнеустойчивости саженцев древесных пород. Практика ведения лесного хозяйства на современном этапе невозможна без новейших научных разработок.

Михаил КУДИН,
Институт экспериментальной ботаники им. В.Ф.Купревича

НАВУКА
www.gazeta-navuka.by
Заснавальнік: Нацыянальная акадэмія навук Беларусі
Выдавец: РУП «Выдавецкі дом «БЕЛАРУСКАЯ НАВУКА»
Індэксы: 63315, 633152. Рэгістрацыйны нумар 389. Тыраж 976 экз. Зак. 512

Фармат: 60 x 84 1/4,
Аб'ём: 2,3 ул.-выд. арк., 2 д. арк.
Падпісана да друку: 14.04.2017 г. у 16:00
Кошт дагаворны
Надрукавана:
РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»,
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
Пр-т Незалежнасці, 79, 220013, Мінск

Галоўны рэдактар
Сяргей Уладзіміравіч ДУБОВІК
тэл.: 284-02-45
Тэлефоны рэдакцыі:
284-16-12 (тэл./ф.), 284-24-51
E-mail: vedey@tut.by
Рэдакцыя: 220072,
г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1,
пакоі 118, 122, 124

ISSN 1819-1444
9 771819 144001 17016